**В номере:**




Сплоченные одной целью — с. 3





Как голосовали жители района — с. 4-5

150 лет пути на книжных страницах — с. 2





Раённая масавая газета. Заснавана 24 сакавіка 1935 года

# Добрушскі край

№61 (10979)

12 жніўня 2020 года
Серада


КОРМАНАРЫХТОЎКА



Арцём Паўловіч (справа) і Генадзь Тутаеў у рэдкія хвіліны адпачынку

# Зялёны марафон "Новага шляху"

## У агракамбінаце "Новы шлях" пачалі ўборку кукурузы на сілас

Кормаўборачны камбайн Арцёма Паўловіча яшчэ напярэдадні вечарам зрабіў пробны праход па кукурузным полі. Першыя 150 тон зялёнай масы пайшлі на падкормку жывёлы. А раніцай у аўторак зялёны канвеер запрацаваў у гаспадарцы на поўную моц.

– Сёлета кукурузу пасеялі на 1400 гектарах, – паведаміў галоўны аграном гаспадаркі Яўген Мрых. – 220 гектараў плануем убраць на зерне. Астатняе – на корм жывёле. Па папярэдніх разліках у траншэі закладзём не менш за 8 тысяч тон сіласу. З 4,5 тысячамі тон травяных кармоў, нарыхтаваных яшчэ вясной, агульны запас удвая перавысіць мінулагодні.

Пробны заезд пацвердзіў ньдрэнную ўраджайнасць кукурузы – каля 300 цэнтнераў зялёнай масы з гектара. І гэта не на самым лепшым полі. Машыны адвозяць масу ад камбайна амаль бесперапынна. Палічылі, колькі часу патрабуецца для загрузкі аднаго аўтамабіля. 9 секунд.

– Калі траву на корм убіралі, то на кожную машыну мінут 10-15 затрачвалі, – расказвае вадзіцель Генадзь Тутаеў. – А тут нават перакурыць часу няма. Рэйс да траншэі зрабіў – займай месца каля камбайна. І так да цямры.


**(Заканчэнне – на 2 с.)**


**Фота Яўгена УСЦІНАВА**

## Весткі з месцаў

### У Карму на дапамогу

**Механізаваны дэсант добрушскіх аграрыяў накіраваўся днямі ў гарпасёлак Карма. Дабраўся туды мехатрад на зернеўборачных камбайнах.**

– Кіраўніцтва Кармянскага раёна, дзе ў аўторак няўбранымі заставаліся каля 40 працэнтаў плошчаў зерневых, звярнулася па дапамогу да кіраўніцтва раёна, – расказаў першы намеснік старшыні Добрушскага райвыканкама Яўген Ігнаценка. – Улічваючы, што ўборачная на Добрушчыне завершана, вырашылі сфарміраваць зводны атрад з чатырох камбайнаў.

На кармянскіх палетках зараз працуюць механізатары сельгаспрадпрыемстваў "Новы шлях", "Цэрахоўка-Агра", "Калінінскі", райаграсэрвісу.

**Сяргей ВОЛЬГІН**

### Пляж даступны для адпачынку

**Райвыканкам зняў забарону на купанне ў Іпуці, уведзеную ў сярэдзіне ліпеня.**

Як паведаміў галоўны дзяржаўны санітарны ўрач раёна Уладзімір Маркевіч, увесь гэты час спецыялісты райЦГЭ рэгулярна даследавалі гарадскія зоны рэкрэацыі. Пробы рачной вады стабільна паказвалі яе небяспечнасць для чалавека.

Аналіз апошніх проб упершыню засведчыў норму па мікрабіялагічных паказчыках. Гэта стала прычынай прыняцьць распараджэнне аб дазволе купання на пляжах каля вуліц Набярэжнай і Кааператыўнай. Забараняючыя знакі дэмантуюць ужо сёння.

**Сяргей МІХАЙЛАЎ**


ISSN 2073-1000


**ПОГОДА**

**Долгота дня 15.03**
**Луна**
**12 августа — в Тельце,**
**13, 14 — в Близнецах**



**Новолуние 19 августа**

| 13 августа | 14 августа |
|---|---|
| **НОЧЬЮ +11…+13** | **НОЧЬЮ +10…+12** |
| **ДНЕМ +17…+19** | **ДНЕМ +17…+19** |
| Сплошная облачность. | Сплошная облачность. |
| Без осадков. | Без осадков. |
| Ветер с.-западный, 4-6 м/с | Ветер северный, 3-5 м/с |

# Президентом Беларуси избран Александр Лукашенко



ЦИК обновил предварительные данные о результатах голосования на выборах Президента Беларуси, сообщает БелТА.

Так, у действующего Главы государства Александра Лукашенко 80,08 процента голосов (его поддержали 4 659 561 избиратель). За Светлану Тихановскую, по обновленным данным, проголосовали 10,09 процента (587 411), Анну Канопацкую – 1,68 процента (97 552), Андрея Дмитриева – 1,21 процента (70 613), Сергея Черечня – 1,15 процента (66 695), против всех – 4,6 процента (267 628).

Число избирателей, принявших участие в голосовании, – 5 818 965. Явка в целом по стране составляет 84,27 процента. В Брестской области проголосовали 92,14 процента избирателей от общего числа включенных в списки по региону, в Витебской – 82,69, Гомельской – 89,7, Гродненской – 88,62, Минской – 84,79 процента. В Могилевской области проголосовали 90,79 процента избирателей, в Минске – 67,26.

Как сообщала на брифинге председатель ЦИК Лидия Ермошина, по мере подготовки заседания Центризбиркома по итогам выборов данные голосования будут уточняться.

# Зялёны марафон “Новага шляху”

**(Заканчэнне. Пачатак – на 1 с.)**

Камбайн спыніўся. Механізатар Арцём Паўловіч нешта разглядае з мастка кабіны.

– Не, не зламаўся, – адказвае механізатар на пытанне журналістаў. – Сцяблiны наматалiся на барабан. Але гэта радуе: ураджай тут неблагі. А наконт паломак, то спадзяюся сезон без іх адпрацаваць. Тэхніка ж амаль новая.

Яшчэ некалькі дзён таму назад Арцём працаваў на зернеўборачным камбайне. Таксама новым. Намалаціў звыш тысячы тон зерня. Зараз памочнік рыхтуе тэхніку для захоўвання, а камбайнер сеў за руль іншага агрэгата.

– Трэці год кукурузу ўбіраю, – расказвае механізатар. – Цяжка адным КВК. Але раней спраўляліся. І зараз зможам. Галоўнае, каб на адвозцы машыны хутчэй мяняліся і паліва было “пад пробку”.

Часу на размовы ў Арцёма няма. Скокнуў на лесвіцу, завёў рухавік і, нібы па моры, камбайн крануўся па зялёным дыване. Толькі дах кабіны і бачны па-над раслінамі. Мы ж накіроўваемся ў бок Селішча, дзе знаходзяцца траншэі для сіласу.

Магутны “Кіравец”, які трамбуе масу, убачылі здалёк. За рулём – Андрэй Гуцаў. У гаспадарцы ён чалавек новы. Працаўладкаваўся толькі вясной. Трактар К-701 выпуску 70-х год мінулага стагоддзя атрымаў у паўразабраным стане.

– Разбітая рулявая, зношаныя гідрацыліндры, – пералічвае ён былыя “хваробы” машыны. – Сабраў яго за лічаныя дні. Тым больш, запчасткі кіраўнік прадпрыемства дастаўляў па першым патрабаванні.



Андрэй Гуцаў



9 секунд – і кузаў поўны

Трамбоўка дзвюх ям з сенажом, як кажуць, “на сумленні” Андрэя.

– Паспеў і ў сваёй гаспадарцы папрацаваць, і дапамогу “Чырвонай Будзе” аказаць, – тлумачыць механізатар. – Справа знаёмая. Педалі націскай ды руль круці. Не хуткасць важная, а ўважлівасць.

**Сяргей ВОЛЬГІН**
**Фота Яўгена УСЦІНАВА**

**К 150-ЛЕТИЮ ФАБРИКИ «ГЕРОЙ ТРУДА»**

# История… в обложке

**Собрать богатую историю своего предприятия под одной книжной обложкой решили, готовясь к его 150-летнему юбилею, в коллективе бумажной фабрики «Герой труда».**

По имеющейся у редакции «ДК» информации, торжества по случаю замечательной даты пройдут в филиале ОАО «Управляющая компания холдинга «Белорусские обои» 19 сентября.




Так выглядит брошюра, выпущенная к юбилею фабрики

Заместитель генерального директора фабрики Александр Мартынов сообщил «ДК»: плод совместных усилий бумажников и издателей – столичного предприятия «Колор Град» – недавно увидел свет. В 130-страничном издании – многолетняя эпопея развития бумажного дела, становления фабричного производства. «Этапы большого пути» запечатлены в текстовых материалах и фотографиях. В них – о создании в 1870 году писчебумажного предприятия в Добруше владельцем Гомельского имения генерал-фельдмаршалом Иваном Паскевичем, выпуске здесь через два года первых тонн бумаги – для упаковки сахара и табака, писчей, газетной, куртузной. О стремительном движении градообразующего предприятия города вперед свидетельствуют и такие цифры: к своему вековому юбилею «Герой труда» производил на территории СССР 67 процентов общего объема чертежной и половину рисовальной бумаги. Каждый седьмой школьник в республиках большой советской страны писал в добрушских тетрадях.

Документальные свидетельства из архивов, публикации прессы разных лет, воспоминания руководителей и известных работников предприятия, сегодняшняя жизнь коллектива «Героя труда»... Расположенные по хронологическим разделам материалы свидетельствуют об исторических этапах фабрики, испытаниях огненных революционных и военных лет, через которые прошли бумажники. Нынешнее время и созидательный труд коллектива, отмечается в книге, проходят в атмосфере добрых надежд на скорый ввод в строй перспективного производства – завода мелованных и немелованных видов картона. Ожидается, что новое структурное подразделение предприятия выпустит первые объемы экспортоориентированной продукции в начале 2021 года.

**Николай ЖДАНОВИЧ**
**Фото Евгения УСТИНОВА**

**НА СВЯЗИ**

**15 августа с 9.00 до 12.00 по телефону 3-00-00**
прямую телефонную линию
с жителями района проведет
Тамара Викторовна СИВУХА,
управляющий делами райисполкома.

* * *

**13 августа с 10.00 до 12.00**
**по телефону 5-27-55**
пройдет прямая телефонная линия с участием
Александра Николаевича РАКИЦКОГО,
начальника районной инспекции природных
ресурсов и охраны окружающей среды.

**ПРИЕМ**

**15 августа с 8.00 до 13.00**
в райисполкоме прием граждан проведет
Тамара Викторовна СИВУХА,
управляющий делами райисполкома.

* * *

**15 августа с 8.00 до 14.00**
в приемной председателя
райисполкома прием граждан проведет
Александр Валерьевич ХАЗОВ,
начальник отдела экономики райисполкома.